**Тэма: Алена Васілевіч. “Сябры”**

**Мэты:** пазнаёміць з апавяданнем ;
арганізаваць абмеркаванне вучнямі маральных якасцей асобы (сяброўскасці, адданасці і спагадлівасці);
садзейнічаць развіццю мыслення і звязнага маўлення;
ствараць умовы для выхавання ў дзяцей чуласці, добразычлівасці, пачуццяў сяброўства і калектывізму.

**Эпіграф:**
“Дружба – вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць... Беражыце дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека”
*Кузьма Чорны*

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант

### II. Новая тэма

1) Уступнае слова настаўніка

- Сёння мы пагаворым пра важнае, неабходнае кожнаму чалавеку пачуццё – пачуццё дружбы. Многія з вас знаёмы з ім і ведаюць пра сяброўства і з жыцця, і з кніг. Мы пазнаёмімся з апавяданнем Алены Васілевіч “Сябры”, пастараемся вызначыць галоўную думку твора і адказаць на пытанне “Каго можна назваць сапраўдным сябрам?” (агучваецца эпіграф урока) + вучні чытаюць на памяць загадзя падрыхтаваны верш М.Танка:
Калі ты ад клапот
Жыццёвых стараніўся,
Ні хлебам, ні вадой
З сябрамі не дзяліўся,
Нікога не сагрэў
Ні словам, ні спагадай
І ніву не прыкрыў
Грудзьмі ад градападу,
Заўсёды за другіх
Хаваўся ў ліхалеццe,-
Лічы, што не было
Цябе нагэтым свеце.

(Абмеркаванне пачутага).

2) Аналіз апавядання

1. Азначэнне паняцця

- Хто такі сябар? *(У тлумачальным слоўніку даецца такое азначэнне. Сябар – 1) той, хто звязаны з кім-небудзь сяброўствам; 2) прыхільнік, абаронца.)*

- Што такое дружба? *(Дружба – блізкія адносіны, заснаваныя на ўзаемным даверы, павазе, супольнасці інтарэсаў.)*

- Часам мы выкарыстоўваем і словы таварыш, прыяцель. Хто такі таварыш? *(1. Таварыш – чалавек, блізкі каму-небудзь па агульнасці поглядаў, дзейнасці, умовах жыцця. 2. Пры савецкай уладзе зварот да грамадзяніна.)*

- Хто такі прыяцель? *(Прыяцель – блізка знаёмы чалавек, з якім устанавіліся сяброўскія адносіны.)*

- Такім чынам, таварыш і прыяцель – гэта не заўсёды сябры.

- Каго можна назваць сапраўдным сябрам? *(чалавек, да якога можна звярнуцца ў любы час; гэта чалавек, які раздзеліць з вамі не толькі нейкія турботы, але і парадуецца за вашы поспехі)*

2. Дыскусія

Парам раздаюцца карткі з цытатамі. Кожная пара павінна выказаць сваё меркаванне: як яны разумеюць выказванні вялікіх людзей.

1. Толькі сапраўдны друг можа цярпець слабасці свайго друга. *(Уільям Шэкспір, англійскі драматург)*
2. Што робіцца і гаворыцца ў гневе, таго паміж сябрамі ў разлік ставіць не патрэбна. *(Генрык Сянкевіч, польскі пісьменнік)*
3. Хто дружбе здрадзіў хоць бы толькі раз, таму няма ўжо веры... *(Насір Хізраў, таджыкскі паэт)*
4. Няправільна будзе, калі я скажу: ён мой друг, а таму ён усё добра робіць; трэба казаць: ён усё добра робіць і таму ён мой друг. *(Кандрат Крапіва, беларускі пісьменнік)*

3. Праца з мастацкім тэкстам

а) Рэтраспектыўна-аналітычная гутарка

- Чаму пра Лёню Саўчанку і Грышу Міхневіча казалі, што іх вадой не разальеш? *(Сядзелі за адной партай. Жылі на адной кватэры. Звярталіся адзін да другога па дапамогу.)*

- Што адбылося паміж хлапчукамі ў школе? Якім паказвае сябе Грыша? *(Грыша атрымаў горшую, чым Лёня, адзнаку, хаця лічыўся лепшым вучнем. Паводзіў ён сябе ганарыста, пагардліва, вінаваціў Лёню.)*

- Раскажыце, як Лёня трапіў у бяду. *(Грыша не пачакаў Лёню па дарозе дадому, і Лёня заблукаў у цёмным заснежаным лесе.)*

- У тэксце ёсць радкі (с.134): “Раней, бывала, калі хто-небудзь з хлопцаў стамляўся ці папраўляў абутак, другі абавязкова чакаў яго, бо ведаў: лепшая надзея і дапамога ў дарозе – таварыш”. Мы згадвалі, што Грыша і Лёня – сябры. Чаму ж аўтар у гэтай сітуацыі выкарыстоўвае слова “таварыш”? *(Бо не трэба быць абавязкова вялікім сябрам для таго, каб дапамагчы чалавеку ў цяжкую хвіліну.)*

- Як выявіў сябе Грыша? Чаму? *(“Ён не бачыў, як садзіўся адпачываць Лёня... Ім кіравала крыўда.)*

- Ці можам мы сказаць, што Грыша кінуў сябра ў бядзе? *(Не. Ён не глядзеў на сябра, каб паказаць сваю крыўду, але яму стала страшна – азірнуўся: стаў непакоіцца за Лёню, хутка пабег па дапамогу дамоў.)*

- Ці правільна зрабіў Грыша, калі пабег дадому, каб расказаць дарослым, што здарылася? *(Так. Сам ён мог бы заблукаць у лесе і не дапамог бы сябру.)*

- Раскажыце аб выратаванні Лёні.

ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА
(Вучні спяваюць “Вясёлую песеньку пра дружбу” і танцуюць )

б) Чытанне па асобах апошняга эпізоду апавядання.

- Што адчуваў Лёня ў час прыходу сябра? *(Ён быў шчаслівы ўбачыць Грышу і ўсё яму дараваў.)*

- Ці паўплывала на Грышу ўся гэта гісторыя? *(Грыша адчуваў сябе вінаватым; ён зразумеў сваю памылку: усё сам расказаў у школе, каб яго выключылі са школы.)*

- Давайце вызначым, што хацела сказаць сваім творам Алена Васілевіч. *(Сяброўства – дапамога, крыўда, радасць за друга, шчасце, павага, дараванне, узаемаразуменне, сорам)*

в) Работа па выяўленні ведаў па кампазіцыі твора.

(Вучням прапануецца план апавядання на інтэрактыўнай дошцы, яны павінны расставіць пункты плана пры дапамозе маркера згодна кампазіцыі твора) .

**IV. Падвязенне вынікаў**

- Пра сілу сапраўднай дружбы складзена нямала прыказак і прымавак. "Збярыце", калі ласка , прыказкі правільна.

(На інтэрактыўнай дошцы напісаны прыказкі ўперамешку, вучні павінны адрэдагаваць іх з дапамогай маркера)

- Каго ж можна назваць сапраўдным сябрам? *(Чалавек, які ніколі не здрадзіць і не кіне ў цяжкую хвіліну; чалавек, які ўмее сябраваць)*

**V. Рэфлексія**

На альбомных лістах дзеці загадзя абвялі свае далонькі, і выразалі іх. Прапаноўваецца на пальцах надпісаць кожнаму вучню свае добрыя якасці. А пасля сваю "далонь"падарыць таму, з кім бы яны хацелі сябраваць у класе.
*(Гучыць песня "Сапраўдны сябар" )*

**VI. Дамашняе заданне**

Напісаць сачыненне " Мой сябар"

# Алена Васілевіч. “Сябры”

Беларуская літаратура
6 клас

З вопыту работы
настаўніцы беларускай
мовы і літаратуры
Татарынавай А.В.